# 25 Сакавіка і ўсё, з ім звязанае

АЛЯКСАНДР НАДСАН*

Кароткі бібліяграфічны агляд твораў
пра змаганне за незалежнасць Беларусі 1900–1921 гадоў
з Бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане

> *“Мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скінулі з роднай зямлі апошнія рэшткі нацыянальнай залежнасці, якую сілай насадзілі расейскія цары на нашу свабодную і незалежную зямлю. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і свабоднай дзяржавай”.*

Гэтыя словы ўзятыя з Дэкларацыі Незалежнасці, прынятай Радай Беларускай Народнай Рэспублікі ў Мінску 25 сакавіка 1918 года. Праз неспрыяльную палітычную сітуацыю дзяржава прабыла незалежнай нядоўга. Нягледзячы на гэта, беларусы ўсяго свету адзначаюць 25 Сакавіка як Дзень Незалежнасці.

У 1772–1795 гадах Беларусь была акупаваная расійцамі і стала часткай Расійскай імперыі. Царскія ўлады надалі ёй статус усяго толькі “Паўночна-заходняга краю” (“Северо-западного края”) Расіі і лічылі, што насельніцтва гэтага краю гаворыць на вясковым дыялекце расійскай мовы. З цягам часу ўсё адметнае на гэтай зямлі было сістэматычна вынішчана, у тым ліку і Грэка-каталіцкая (Уніяцкая) Царква, да якой належала большасць беларусаў. Палякі, ці, хутчэй, спаланізаваная беларуская зямельная арыстакратыя, трымаліся супрацьлеглага меркавання – яны лічылі Беларусь польскай правінцыяй. Нягледзячы на гэта, на пачатку XIX стагоддзя беларускі нацыянальны рух разгарнуўся, а пасля распрыгоньвання сялянаў у 1861 годзе гэты рух увабраўся ў сілу. У 1862 годзе рэвалюцыйны лідар Кастусь Каліноўскі (павешаны расійцамі ў 1864 годзе) пачаў выдаваць падпольную газету “Мужыцкая праўда”. Усяго праз дваццаць гадоў пасля гэтага беларуская група руху Народная воля ў нелегальнай газеце “Гоман” ужо падымала пытанне беларускай аўтаноміі. У канцы XIX стагоддзя з’явіліся новыя

* Айцец Аляксандр Надсан – апостальскі візітатар для беларускіх грэка-каталіцкіх вернікаў за мяжой і дырэктар Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны і Музея ў Лондане.

беларускія пісьменнікі і паэты, самым выбітным сярод якіх быў Францішак Багушэвіч (1840–1900), які нагадваў беларусам: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”. Але першая беларуская партыя, Беларуская рэвалюцыйная грамада, была заснаваная толькі ў 1903 годзе. Праз два гады яна, ужо пад больш дакладнай назвай Беларуская сацыялістычная грамада, адыграла важную ролю ў рэвалюцыі 1905–1907 гадоў. У наступныя гады сябры Грамады супрацоўнічалі з газетай “Наша Ніва”, якая да свайго закрыцця ў 1915 годзе заставалася ў эпіцэнтры беларускага палітычнага і культурнага жыцця. Грамада на той час была адзінай беларускай палітычнай партыяй. Іншыя тагачасныя партыі на гэтай зямлі – расійскія, польскія, гэбрайскія – былі, за рэдкім выключэннем, абыякавымі ці нават адкрыта варожымі да беларускіх нацыянальных памкненняў.

Праз год пасля пачатку Першай сусветнай вайны, улетку 1915 года, лінія фронту падзяліла Беларусь між нямецкімі і расійскімі войскамі. Цяжкасці вайны ўскладняліся яшчэ і праблемай перасяленняў: перад тым як адступіць з Заходняй Беларусі і аддаць яе немцам, расійскія ўлады эвакуявалі больш за мільён тамтэйшых жыхароў у глыб Расіі і ў асноўным пакінулі іх там на волю лёсу. Такой была сітуацыя ў Беларусі на момант Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. З таго моманту падзеі хутка развіваліся.

Часовы расійскі ўрад Керэнскага быў, у сваю чаргу, зрынуты і пакінуў тэрыторыю немцам у лютым 1918 года. У снежні таго ж года немцы адступілі, а ў Беларусі зноў запанавалі камуністычныя саветы – паўсюль, акрамя Гарадзенскай вобласці на захадзе. У канцы вясны – на пачатку лета 1919 года Беларусь была акупаваная палякамі, якія заставаліся на яе тэрыторыі да лета 1920 года. На фоне бясконцых палітычных перамен беларусы спрабавалі заснаваць сваю ўласную незалежную дзяржаву. Дзякуючы іх высілкам у снежні 1917 года ў Мінску адбыўся Ўсебеларускі кангрэс, а 25 сакавіка 1918 года была абвешчаная незалежная Беларуская Народная Рэспубліка (Беларуская Народная Рэспубліка – скарочана БНР). Аднак шанцаў выжыць у яе было мала.

У снежні Рада і Ўрад БНР пакінулі Мінск і атабарыліся ў Горадні, якая на той час была цэнтрам паўаўтаномнага беларускага рэгіёна ў межах Літоўскай Рэспублікі. Польскае ўварванне ўвесну 1919 года парушыла гэтыя межы, і Ўрад БНР выехаў у выгнанне. Спадзяванні некаторых яго чальцоў на тое, што палякі дапамогуць аднавіць незалежнасць Беларусі, хутка расталі. У той самы час савецкія ўлады, што, як і Расійскі Часовы Ўрад перад імі, варожа ставіліся да ідэі беларускай незалежнасці, пачалі лічыцца з моцнымі нацыянальнымі пачуццямі беларусаў і з ціскам, які аказвалі ў Расіі разнастайныя таварыствы ўцекачоў з Беларусі. 1 студзеня 1919 года была

абвешчаная Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (скарочана БССР, хоць першапачаткова яна называлася Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, ці ССРБ). Новае дзяржаўнае ўтварэнне праіснавала нядоўга: у лютым таго ж года яно стала часткай новай дзяржавы, Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Калі спадзяванні на ўсталяванне ў Літве савецкага парадку зніклі, ад апошняй задумы адмовіліся, і ў 1920 годзе была адноўлена БССР у сваёй пачатковай форме. Тэрытарыяльна, аднак, Рэспубліка складала толькі невялікую частку Ўсходняй Беларусі (шэсць раёнаў Менскай вобласці), у той час як заходняя частка заставалася пад палякамі. Такі падзел Беларусі быў нарэшце ратыфікаваны ў 1921 годзе савецка-польскай Рыскай дамовай і праіснаваў да 1939 года.

Нават такі кароткі агляд дазваляе ўявіць, як складана студэнтам вывучаць гісторыю Беларусі першых двух дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Пры гэтым яны не маюць нават надзейнага бібліяграфічнага даведніка. Ніжэй прапануецца не такі даведнік, а ўсяго толькі апісанне некаторых даступных у Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лондане матэрыялаў па тэме.

Адной з нешматлікіх бібліяграфічных прац з'яўляецца *A Bibliographical Guide to Belorussia* / "Бібліяграфічны даведнік па Беларусі" Н. Вакара (Гарвард, 1956). Раздзел, прысвечаны пачатку XX стагоддзя (№ 1022-1160 і 1384-1509), карысны хоць бы ў якасці пачатку. Іншая праца, "Бібліяграфія па гісторыі Беларусі" М. Кракене і А. Сакольчыка (Мінск, 1969), утрымлівае вялікі раздзел (№ 3782-4453), прысвечаны перыяду ад 1900 года да лютага 1917 года. У яго ўключаныя працы толькі на беларускай, расійскай і ўкраінскай мовах, і далёка не ўсе з іх. Працы такіх аўтараў, як У. Ігнатоўскі, А. Станкевіч, А. Луцкевіч, А. Цвікевіч, Я. Найдзюк, не прыгадваюцца.

Для разумення падзей 1900–1921 гадоў карысна разабрацца ў падзеях папярэдняга перыяду, прынамсі з 1861 года. Гісторыя ўсяго перыяду з 1861 да 1917 года ў другім і трэцім тамах пяцітамовай "акадэмічнай" "Гісторыі Беларускай ССР" (Мінск, 1971–1975) паказаная з афіцыйнага, савецкага пункту гледжання і характарызуецца тыповымі хібамі такіх выданняў, а менавіта перадузятасцю і замоўчваннем нязручных фактаў. Новая "акадэмічная" праца "Нарысы па гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй М.Касцюка і інш. (два тамы, Мінск 1994–1995) спрабуе даць больш аб'ектыўны погляд на гісторыю. Іншыя агульныя працы па гісторыі Беларусі, у тым ліку часткі па дадзеным перыядзе, уключаюць у сябе "Беларусь учора і сёння" Я.Найдзюка (Мінск, 1943; другое выданне Мінск, 1993); *Weissruthenien: Volk und Land* / "Беларутэнія: людзі і зямля" Э. фон Энгельгарта (Берлін, 1943) і *Belorussia: the Making of a Nation* / "Беларусія: стварэнне нацыі" Н. Вакара (Гарвард, 1957), напісаная ў трошкі паблажлівым тоне.

*Belarus at the Crossroads of History* / “Беларусь на скрыжаванні гісторыі” Я. Запрудніка (Бульдэр-Оксфард, 1993; другое выданне Мінск, 1996) з’яўляецца грунтоўнай працай вядомага беларускага гісторыка і можа стаць выдатнымі ўводзінамі да гісторыі Беларусі ў цэлым і да руху за незалежнасць у прыватнасці. *Historia Białorusi* / “Гісторыя Беларусі” Захара Шыбекі, выдадзеная ў Любліне ў 2002 годзе па-польску, а таксама яе пашыраная беларуская версія “Нарыс гісторыі Беларусі 1795–2002” (Мінск, 2003), з’яўляецца яшчэ адной сучаснай грунтоўнай працай, у якой ёсць частка, прысвечаная дадзенаму перыяду; “Гісторыя Беларусі XIX і пачатку XX сталецця” У. Ігнатоўскага (Мінск, 1926) прысвечаная беларускай гісторыі ад пачатку XIX стагоддзя да 1921 года. Кніга А. Станкевіча “Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення” (Вільня, 1934) – гэта цікавае даследванне беларускага нацыянальнага руху 1862–1921 гадоў. Кніга Ф.Турка “Белорусское движение” / “Беларускі рух” (Масква, 1921; рэпрынт, Мінск, 1992) ахоплівае прыблізна гэты ж перыяд, але факусуецца на 1905–1920 гадах. Гэта ўсебаковае фактaлагічнае вывучэнне перыяду, напісанае з рэдкай аб’ектыўнасцю і падмацаванае вялікай колькасцю дакументальных сведчанняў. “Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917)” / “Нарысы па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі (1863–1917)” С. Агурскага (Мінск, 1928) таксама абапіраюцца на дастатковую колькасць дакументаў. Аднак, у адрозненне ад Турка, аўтара ў асноўным цікавяць не беларускія партыі, а ў першую чаргу РСДРП (як тады называлася Расійская Камуністычная партыя).

Кніга *Byelorussian Statehood* / “Беларуская дзяржаўнасць” В. і З. Кіпеляў (Нью-Ёрк, 1988) – гэта крыніца ведаў па гісторыі Беларусі 1917–1921 гадоў; у яе ўключаныя тэксты людзей, што непасрэдна бралі ўдзел у падзеях 1917–1921 гадоў, такіх як Крэчэўскі, Варонка, Захарка, артыкулы гісторыкаў Я. Запрудніка, П. Урбана і Я. Менскага, біяграфічныя сведчанні пра больш як 60 беларускіх палітычных лідараў дадзенага перыяду, бібліяграфія і храналагічная табліца падзеяў. Гэта абавязковае чытанне для тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускага змагання за нацыянальную незалежнасць.

Дакументы па дадзеным перыядзе друкаваліся мала і расцярушаныя па розных выданнях. Аб’ёмістыя трэці і чацверты тамы “Документов и материалов по истории Белоруссии” / “Дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусіі” (Мінск, 1953 і 1954) утрымліваюць дакументы 1900–1917 гадоў і 1917–1919 гадоў, усе па-расійску, і марна шукаць у іх прыгадку пра Беларусь, а тым больш пра БНР. Што да беларускіх дакументаў, акрамя ўжо згаданай кнігі Турка (39 дакументаў), варта прыгадаць “Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі” А.Зюзкова (Мінск, 1932). Аўтар, варожа ставячыся да беларускага нацыянальнага руху, у дадатку падае тэксты 31 дакумента за

1917–1921 гады. Яшчэ адна вялікая калекцыя (58 дакументаў) прыводзіцца ў працы "За дзяржаўную незалежнасць Беларусі" пад рэд. І. Касяка (Лондан, 1960). Сапраўды манументальнымі сталі "Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі" пад рэд. С. Шупы (дзве кнігі, Вільня–Нью-Ёрк, 1998), у якія ўвайшлі 3000 дакументаў БНР з Літоўскага дзяржаўнага архіва.

Сярод прац па дадзеным перыядзе – 1900–1917 гадоў найперш варта прыгадаць "За дваццаць пяць гадоў" А. Луцкевіча (Вільня, 1928; другое выданне Мінск, 1991, з пасляслоўем А. Сідарэвіча). Аўтар, адзін з піянераў беларускага нацыянальнага руху, прасочвае гісторыю першай беларускай палітычнай партыі, Беларускай Сацыялістычнай Грамады, і прыгадвае людзей і падзеі, звязаныя з яе дзейнасцю. Частка "Беларускае Нацыянальнае Адраджэнне (1902–1915)" у кнізе "З гісторыі Беларусі" Я. Станкевіча (Мюнхен, 1958) утрымлівае шмат цікавага матэрыялу па беларускім нацыянальным руху, у якім аўтар актыўна ўдзельнічаў. У кнізе "Большевизм в революционном движении Белоруссии" / "Бальшавізм у рэвалюцыйным руху Беларусі" Н. Недасека (Мюнхен, 1956) даецца ацэнка ролі камуністаў у беларускім руху. Важны аспект беларускай нацыянальнай дзейнасці да 1917 года раскрываецца ў доктарскай дысертацыі Я.Запрудніка *Political Struggle for Byelorussia in the Tsarist State Dumas 1906–17 /* "Палітычная барацьба за Беларусь у царскіх дзяржаўных Думах 1906–1917" (машынапісны тэкст, Нью-Ёрк, 1966) і ў шэрагу артыкулаў на тую ж тэму, такіх як "Барацьба за аўтаномію Беларусіі ў першай дзяржаўнай Думе" ("The Journal of Belarusian Studies", том II, № 3, Лондан, 1971) і "Беларускія прадстаўнікі ў другой дзяржаўнай Думе" (тамсама, том III, № 3, 1975). Развіццё беларускай прэсы, і ў прыватнасці газеты, разглядаецца ў кнізе С.Александровіча "Пуцявіны роднага слова" (Мінск, 1971) і ў ягоным жа артыкуле "Наша Ніва" (Часопіс беларускіх даследаванняў, том I, № 3, 1967). Дарэчы, падборкі газет "Наша Доля" (1906) і "Наша Ніва" (за 1906–1911 гады) цяпер даступныя ў факсімільных выданнях. "Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе" Р.Семашкевіча (Мінск, 1971) прысвечана даследаванню жыцця беларускай супольнасці (у асноўным студэнтаў) у Пецярбурзе і іх ролі ў беларускім нацыянальным руху.

Выйшла некалькі аповедаў сведак падзей з лютага 1917 да 1921 года. Э. Канчэр у сваім "Белорусском вопросе" / "Беларускім пытанні" (Петраград, 1919) змясціў адно з першых занатаваных апісанняў Усебеларускага кангрэсу ў снежні 1917 года і падзей, што прывялі да абвяшчэння незалежнасці 25 сакавіка 1918 года, што яму было не даспадобы. Я. Варонка, першы прэм'ер-міністр БНР, падаў сваю версію падзей у тэксце "Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции» / "Беларускае пытанне на момант Версальскай мірнай канферэнцыі" (Каўнас, 1919) і ў "Беларускім

руху ад 1917 да 1920 гадоў» (Каўнас, 1920). Сярод іншых сучасных публікацый варта прыгадаць “Короткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики” / “Кароткі нарыс узнікнення Беларускай Народнай Рэспублікі” А.Цвікевіча (Кіеў, 1918) і “Ўсходнюю Беларусь” А.І. (Мінск, 1918), у якой падаецца падрабязная карціна ўзмацнення беларускага руху ажно да абвяшчэння незалежнасці. Ёсць таксама першы і адзіны нумар часопіса “Варта” (Мінск, 1918), паўафіцыйны орган Беларускага Ўрада. П. Крэчэўскі, сябра першага Беларускага Ўрада і пазней прэзідэнт Рады БНР, піша пра падзеі 1917–1918 гадоў у артыкуле “Беларусь у мінулым і сучасным” у першым (і адзіным) нумары часопіса “Замежная Беларусь” (Прага, 1926). Крэчэўскага заступіў Васіль Захарка, які таксама браў актыўны ўдзел у першым Беларускім кангрэсе і абвяшчэнні незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 года, а таксама ў наступных падзеях. Яго “Галоўныя моманты беларускага руху”, напісаныя ў 1926 годзе (машынапісны тэкст у Бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лондане), былі нарэшце надрукаваныя Беларускім інстытутам мастацтва і навук у “Запісах” (№ 24, Нью-Ёрк, 1999, с. 5–87).

“Да першага Ўсебеларускага з’езду 1917”, пад рэдакцыяй І. Запрудніка (“Запісы”, Мюнхен, № 3, 1964; № 4, 1966) – карысны збор матэрыялаў і дакументаў па Ўсебеларускім кангрэсе, у які ўключаныя матэрыялы з публікацый, што ўжо паспелі стаць рарытэтам.

Спробы ўтварыць беларускае войска апісаныя ў розных артыкулах, такіх як “Беларускія вайсковыя фармацыі на румынскім фронце” С.К. (часопіс “Крывіч, № 1, Каўнас, 1923”), “Беларуская вайсковая Цэнтральная Рада” К. Езавітава (тамсама, № 7, 1924, № 9, 1925); “Гістарычны каляндар беларускіх аддзелаў літоўскага войска” А. Сама (Крыніца, Вільня, № 4, 1939, №7, 16, 27, 40, 1940); “Першы беларускі полк у Горадні і як палякі раззброілі яго” А.Успенскага (Раніца, Берлін, № 44, 1943, et seq); “25 Угодкі горадзенскае губернскае ўправы” В.Б. (тамсама, № 49-50, 1943; 1-2, 1944). Адзіны нумар “На чужыне” (Рыга, 1920), органа генерала С. Булах-Балаховіча і яго “прыватнага войска”, будзе цікавы пры даследаванні асобы гэтага неадназначнага дзеяча, які прынёс больш няёмкасці БНР, чым дапамогі. *Białoruskie formacje wojskowe 1917–1923 /* “Беларускія вайсковыя ўтварэнні” А.Латышонка (Беласток, 1995) – гэта першае вычарпальнае даследаванне беларускіх вайсковых адзінак. Яшчэ адно свежае выданне – “Польская палітыка ў Беларусі падчас польска-бальшавіцкай вайны 1919–1920 гадоў” Ф.Кушаля ў яго “Спробе стварэння беларускага войска” (Мінск, 1999).

Савецкія гісторыкі мала пісалі пра БНР, і амаль заўсёды ў негатыўным ключы. Добры прыклад – кніга Зюзкова (гл. вышэй). Сярод больш позніх выданняў можна назваць “Непазбежнае банкруцтва” М. Сташкевіча (Мінск,

1974), а таксама яго ж *Почему не состоялась БНР?* / “Чаму не адбылася БНР?” (Мінск, 1980), напісанае ім у суаўтарстве з І.Коўкелем і выдадзенае па-ангельску ў Мінску ў 1983 годзе. З іншага боку, шмат прац было напісана пра ўтварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі, і амаль усім ім уласцівыя адныя і тыя ж недахопы, а менавіта: аднабаковасць і прыхаванне нязручных фактаў. Гэта такія выданні, як “Утварэнне Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі” (Мінск, 1946) і *Белорусский народ в борьбе за советскую власть* / “Беларускі народ у барацьбе за савецкую ўладу” (Мінск, 1963) Н. Каменскай; *Создание и упрочнение советской государственности* / “Стварэнне і ўмацаванне савецкай дзяржаўнасці” С.Маргунскага (Мінск, 1958); *Победа советской власти в Белоруссии* / “Перамога савецкай улады ў Беларусі” пад рэдакцыяй І.Мінца (Мінск, 1967). *Рождение Белорусской Советской Республики* / “Нараджэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі” В.Круталевіча (Мінск, 1975) – больш грунтоўная праца, хоць і напісаная ў такім жа духу. Яго больш позняя праца “Станаўленне нацыянальнай дзяржаўнасці” (Мінск, 1999), напісаная ў трошкі іншых варунках, утрымлівае багаты факталагічны матэрыял. Сярод прац несавецкіх аўтараў варта прыгадаць *Большевизм на путях к установлению контроля над Белоруссией* / “Бальшавізм на шляху да ўсталявання кантролю над Беларуссю” Н.Недасека (Мюнхен, 1954) і яго “Нацыянальную самаідэнтыфікацыю за Саветамі” (*Belorussian Review* / “Белорашн Рэўю”, № 8, Мюнхен, 1960), а таксама “Ўтварэнне Беларускай ССР” Я. Менскага (тамсама, № 1, 1955).

Беларуска-польскія стасункі і, у прыватнасці, польская акупацыя 1919–1920 гадоў разглядаюцца ў такіх працах, як “Адраджэнне Беларусі і Польшчы” А. Цвікевіча (Берлін, 1921); *Белорусы и поляки* / “Беларусы і палякі” К. Езавітава (Каўнас, 1919); *Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции* / “Беларускае пытанне на момант Версальскай мірнай канферэнцыі” І. Варонкі (Каўнас, 1919); “Польская акупацыя Беларусі” А. Луцкевіча (Вільня, 1920); “Успаміны аб польскай акупацыі Гродзеншчыны” І.Антонава (не пазначана, 1921) і ў нелегальным часопісе “Сялянская Доля” (не пазначана, 1921–1922). Польскі погляд на Беларусь сфармуляваны ў *Les Confins Orientaux de la Pologne* / “Усходнія межы Польшчы” (Парыж, 1919), афіцыйным выданні для Версальскай канферэнцыі. Сярод іншых прац варта прыгадаць “Żywioł polski na ziemiach litewskich” М. Свяхоўскага (Закапанэ, 1917); “Polska a Litwa i Białoruś” Я.Сараковіча (Варшава, 1919); “Państwo Polskie a kwestia białoruska” Ш. Браноўскага (Варшава, 1919); “Litwa i Białoruś” Л. Васілеўскага (Варшава, 1925); “Sprawa białoruska” С. Ельскага (Варшава, 1931); “Federalizm. Litwa i Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI 1918-IV 1920)” Я. Левандоўскага (Варшава, 1962); “Polityka Wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Białorusi i Ukrainy (1918–1919)” А. Дэругі (Варшава, 1969) і іншыя.

Становішча беларускіх каталікоў і іх ролю ў беларускім нацыянальным жыцці даследаваў А. Станкевіч у працах “Родная мова ў святынях” (Вільня, 1929) і “Беларускі хрысціянскі рух” (Вільня, 1939). Надзвычай цікавыя і апошнія дзве часткі яго кнігі “Хрысціянства і беларускі народ” (Вільня, 1940).

К. Сваяк (Фр. К. Сцяповіч) у дзённіку “Дзея маёй мыслі, сэрца і волі” (Вільня, 1932; другое выданне ў Лондане) апісвае тыя цяжкасці, з якімі сутыкаецца малады беларускі каталіцкі святар у пастырскай працы. Глыбокаму вывучэнню гэтага пытання прысвечаная і праца Т. Гурскага “*Stosunek Biskupa Jerzego Matulewicza do spraw językowych w diecezji wileńskiej*, *1918–1925*” (Варшава, 1970). Падобнай працы, прысвечанай праваслаўнай царкве, няма, але можна знайсці пэўную інфармацыю ў кнізе “Беларусь” архіяпіскапа Афанасія (Буэнас-Айрэс, 1966; другое выданне Мінск, 1990). Таксама варта прыгадаць кнігу Т. Процькі “Пакутнік за Веру і Бацькаўшчыну” (Мінск, 1996), прысвечаную праваслаўнаму мітрапаліту Мельхісэдэку (1876–1931) і яго спробам заснаваць Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву.

Шмат карыснай інфармацыі можна знайсці ў газетах таго часу, у прыватнасці ў “Гомане” (Вільня, 1916–1918), “Беларускім жыцці” (Вільня, 1919), “Беларусі” (Мінск, 1919–1920). У Бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лондане ёсць няпоўныя падборкі гэтых выданняў. З 1989 года ў часопісах “Полымя”, “Нёман” і асабліва “Спадчына”, што выходзілі ў Мінску, з’явілася шмат цікавых і каштоўных артыкулаў, а таксама да гэтага часу недаступных матэрыялаў.

Такое апісанне не прэтэндуе на вычарпальную бібліяграфію, але паказвае багацце матэрыялаў пра змаганне беларусаў за сваю нацыянальную ідэнтычнасць на пачатку XX стагоддзя і абвяшчэнне незалежнасці 25 сакавіка 1918 года. У наступныя гады ўлады ў Беларусі зрабілі ўсё магчымае, каб беларусы забылі гэтую падзею, як і рэшту сваёй гісторыі. Наступствы такой палітыкі ўсё яшчэ адчувальныя.

У 1991 годзе, калі распаўся Савецкі Саюз, Беларусь атрымала незалежнасць. Аднак эйфарыя ад незалежнасці цягнулася нядоўга. Сёння Беларусь нагадвае не столькі незалежную дзяржаву, колькі рэзервацыю абарыгенаў амаль зніклага віду “Гома саветыкус”. У краіне пануе рэжым, легітымнасць якога выклікае сумневы і які з’яўляецца беларускім толькі намінальна. Калі беларусы хочуць застацца нацыяй у будучыні, ім мусова згадаць пра сваю гісторыю і нацыянальную годнасць. Вось такія думкі прыходзяць на гадавіну абвяшчэння беларускай незалежнасці 25 сакавіка 1918 года. Дарэчы, дакладна як у савецкія часы, афіцыйнае ўшанаванне гэтай даты ў сучаснай “незалежнай” Беларусі забароненае.